Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 САКАВІКА 2018 г. СУБОТА № 57 (28673)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Салдацкі анёл на зямлі**

СТАР. 4



**Дзецям і дарослым патрэбна мастацтва**

СТАР. 9



**Афрыка — зона свабоднага гандлю**

СТАР. 12

# Фоталетапісец запаведных мясцін



Дзяніс ІЎКОВІЧ паказвае свае новыя работы супрацоўніцы аддзела турызму Алене ВАШКЕВІЧ.

Дзяніс ІЎКОВІЧ — біёлаг, навуковы супрацоўнік Бярэзінскага біясфернага запаведніка. Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта займаецца экалогіяй адкрытых экасістэм у гэтай прыродаахоўнай установе. Але сваё жыццё малады навуковец не ўяўляе без фатаграфіі. І ў жанры пейзажа, фаўны заявіў пра сябе як сапраўдны фотамастак. Дзянісавы творы можна ўбачыць у Музеі прыроды, калі наведаць запаведную вёску Домжарыцы. Вялікія фотапостары вучонага і фатографа надзіва гарманічна ўпісаліся ў экспазіцыйныя залы, яскрава адлюстроўваючы ўнікальную прыроду.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Лепельскі раён.*

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

*«Развіццё малога бізнесу дазволіць нам вырашыць пытанні рынку працы. Будучыня, з пункту гледжання эканамічнага росту, з пункту гледжання якаснага рынку працы, менавіта за развіццём малога бізнесу. Мясцовыя ўлады павінны аказаць максімальную дапамогу прадпрыемствам, якія стартавалі ў 2016—2017 гадах. Асаблівая ўвага тым, хто пачынае дзейнасць сёлета. Мы павінны падставіць ім не адно, а два плячы. Каб прадпрыемствы ствараліся не паўгода, а пачыналі працаваць (выпускаць прадукцыю альбо аказваць паслугі) праз адзін-два месяцы пасля рэгістрацыі. І няхай сёння на гэтых прадпрыемствах працуюць 2-3 чалавекі, заўтра іх можа быць ужо 15 і больш. Развіццё такіх прадпрыемстваў — крыніца эканамічнага росту рэгіёнаў».*

ISSN 1990 - 763X

18057>

9 771990 763008

■ Камунальныя стасункі

# ПРЫКІНЕШ НА ВОКА, А ЗАПЛАЦІШ ПА ПОЎНАЙ

## Пераплата і недаплата за энергарэсурсы — аднолькавае парушэнне

**«У мяне ўсё наперад аплачана: па 20 «кубоў» газу ды вады, а яшчэ — электрычнасці на 250 кілават больш, чым нагарэла», — хвалілася адна суседка другой. «А я не тыя лічбы глядзела — цяпер неяк трэба 15 кубаметраў вады гарачай «падагнаць», а дорага ж адразу», — гаруе тая. Насамрэч, пераплачваць трэба абедзвюм жанчынам, бо кожная з іх па-свойму парушае закон.**

### На карысць дзяржавы ці сябе?

Жыхары, як правіла, не сочаць за супадзеннем лічбаў на прыборах уліку энергарэсурсаў: газу, вады ды электрычнасці — з тымі, якія яны называюць пры аплаце камунальных паслуг. Уносячы грошы наперад, многія лічаць, што такім чынам падстрахоўваюць сябе, каб раптам не апынуцца ў запазычанасці. А некаторыя свядома перад чарговым узняццем тарыфаў на «камуналку» загадзя паболей выстаўляюць, пакуль яшчэ старыя лічбы. І нават калі бачаць, што лічыльнік сапсаваўся, працягваюць плаціць па неіснуючых паказаннях у надзеі атрымаць выгаду. А ёсць яшчэ тыя, хто лічыць пераплату карыснай для пастаўшчыка рэсурсу, маўляў, я ж такім чынам яго крэдытую, і мае грошы можна пракручваць, зарабляючы на гэтым.

СТАР. 7

■ Ёсць пытанне

# НАЗАД З МІНУЛАГА

## Ці трэба вяртаць зніклыя будынкі?

**Разважаючы аб страчанай архітэктуры Мінска, гісторыкі звычайна дзеляцца на два лагеры. Адны шкадуюць кожны дом, бо ён нёс у сабе аўтэнтычныя, назаўжды згубленыя рысы. Другія — заклікаюць адумацца і прызнаць, што грандыёзныя, уражальныя прыгажосцю або наватарствам думкі збудаванні ніколі не былі моцным бокам у мінулым шараговага губернскага горада. Магчыма, і так, але не на адной жа парадней «архітэктуры» будуецца жыццё. Гэта як з біяграфіяй чалавека: часам два факты з яго дзяцінства раскажуць пра асобу больш, чым пералічэнне ўсіх рэгалій энцыклапедыі.**

СТАР. 13



Храм Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў Мінску.

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ І ВЫЙГРАЙ КАРЫСНЫЯ ПРЫЗЫ!

Вы яшчэ паспяваеце падпісацца на «Звязду» на II квартал 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# Мір для сябе і для іншых

**Сустрэчай з кіраўніцтвам урада і духоўным лідарам, інтэрв'ю тэлебачанню завяршыўся візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Грузію. Багатая праграма стала нагодай выказаць сваю пазіцыю не толькі па беларуска-грузінскіх адносінах, але і па сітуацыі ва Украіне, узаемаадносінах з Еўрапейскім саюзам і Расіяй.**

## Кадравыя пытанні і гісторыя беларускіх лётчыкаў

У развіцці супрацоўніцтва з Грузіяй адзін з галоўных акцэнтаў трэба зрабіць на падрыхтоўцы кадраў. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі заявіў на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Грузіі Георгіем Квірыкашвілі. «Мы дамовіліся, што не проста будзем гандляваць, не проста ствараць сумесныя прадпрыемствы, але мы дамовіліся вучыць людзей, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Можна прадаць тэхніку, тэхналогіі сюды прывезці, але, калі кампетэнцыі не будзе ў мясцовых людзей менавіта гэтым займацца, перспектыў мала».

Аляксандр Лукашэнка таксама лічыць важным пры стварэнні сумесных прадпрыемстваў развіваць лакалізацыю. Беларусь гатова дапамагчы Грузіі ў развіцці сельскай гаспадаркі, у тым ліку сучаснымі тэхналогіямі, ствараючы навуковыя цэнтры.

У сваю чаргу Георгій Квірыкашвілі расказаў гісторыю, якую назваў залатой старонкай у адносінах народаў дзвюх краін. Яна звязана з эпізодам, калі беларускія лётчыкі ў мінулым годзе прымалі ўдзел у тушэнні лясных пажараў на тэрыторыі Грузіі. Прэм'ер-міністр тады асабіста кіраваў арганізацыяй работ, і ў адзін з вечароў да яго падышоў святар, які трымаў у руках абраз Багародзіцы. Ён папрасіў дапамагчы знайсці беларускіх лётчыкаў. Справа ў тым, што камандзір экіпажа заходзіў у царкву і хацеў купіць абраз, аднак святара на той момант не было на месцы. Тады лётчык набраў у ёмістасць асвечаную ваду, сказаўшы, што разалье яе над лесам, які гарэў. Цяпер святар шукаў камандзіра, каб падарыць абраз. Аляксандр Лукашэнка ў адказ адзначыў, што для яго гэта гісторыя новая і вельмі кранальная.

## Вялікая вайна пачынаецца з малой бойкі

Таксама кіраўнік беларускай дзяржавы сустрэўся з Каталікосам-Патрыярхам усяе Грузіі, Архіепіскапам Мцхецкім і Тбіліскім, Мітрапалітам Піцунды і Цхум-Абхазецкі Іліёй II. Беларускі лідар перадаў Іліё II прывітанне ад мітрапаліта Філарэта і мітрапаліта Паўла.

Прэзідэнт адзначыў важную ролю царквы ў забеспячэнні адзінства грузінскага народа. «Я ўжо не гавару аб нядаўнім мінулым, у якім грузінская царква адыграла галоўную ролю ў захаванні дзяржаўнасці», — дадаў беларускі лідар. Гаворачы аб сітуацыі ў рэгіёне і канфліктах, Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь выступае толькі за мірнае вырашэнне ўсіх праблем. Больш за тое, неабходна ўстанаўліваць адносіны паміж бакамі канфліктаў, нягледзячы ні на якія рознагалоссі.

У Беларусі будуць заўсёды імкнуцца падтрымліваць добрыя адносіны, у краіне захоўваюцца міжканфесійныя мір і згода, адзначыў Прэзідэнт. «Гэта наш брэнд, добрая рэклама нашай краіны — гэты мір і спакой. І мы будзем рабіць усё для таго, каб такі мір і спакой былі не толькі ў нашых суседзяў, але і ў любой іншай дзяржаве. І гатовы ў гэтым напрамку зрабіць усё тое, што захочуць гэтыя дзяржавы, як гэта было і ў выпадку з Украінай», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка і Ілія II абмяняліся памятнымі падарункамі і запалілі свечку. Сын Прэзідэнта Беларусі Мікалай, які прысутнічаў на сустрэчы, выканаў на раялі серэнаду Шуберта. Ілія II сам піша музыку, і ўдзельнікі сустрэчы таксама паслухалі творы яго аўтарства.

## Адзінае пажаданне — каб самім усё вырашаць

Беларускі лідар даў інтэрв'ю прадстаўнікам грузінскага тэлебачання. У ім ён закрануў тэму ўзаемаадносін з Расіяй. Прэзідэнт разлічвае на пазітыўнае развіццё беларуска-расійскіх адносін у час новага прэзідэнцкага тэрміну Уладзіміра Пуціна, з якім у Аляксандра Лукашэнкі добрыя адносіны. «Калі пытанні ўзнікалі і дзесьці накопліваліся, не было таго выпадку, каб мы не вырашылі сітуацыю. На жаль, накопліваюць пытанні і міністры, і ўрады з двух бакоў. Тады нам (Прэзідэнтам. — **«Зв.»**) даводзіцца падключацца. На жаль. Гэтага быць не павінна. І мы часта аб гэтым гаворым на нашых сумесных беларуска-расійскіх мерапрыемствах, што міністры і ўрады павінны ўсё ж такі вырашаць пытанні і не выносіць іх на верхні ўзровень. Але гэта жыццё, нікуды ад гэтага не дзенешся», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнту таксама было зададзена пытанне, якія яго патрабаванні да Еўрасаюза. «Вы ведаеце, у мяне няма да іх абсалютна ніякіх патрабаванняў. Я хачу, каб нас паважалі і лічылі, што ёсць такая дзяржава ў цэнтры Еўропы. Еўрасаюз павінен разумець каштоўнасць Беларусі на сённяшні дзень».

Пры гэтым ён заклікаў не вучыць Беларусь дэмакратыі. «Не трэба нас штурхаць у спіну. Гэта не патрабаванні. Гэта мае пажаданні», — заявіў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка таксама лічыць непрымальным, каб Беларусь ставілі перад выбарам, з кім супрацоўнічаць і развіваць адносіны. «Мы нават перагаворы не хочам весці і разважаць на гэту тэму. Мы — незалежная дзяржава са сваёй знешняй палітыкай. А сутнасць нашай знешняй палітыкі — шматвектарнасць, і другое — не ствараць праблем нашым суседзям», — падкрэсліў Прэзідэнт.

**Паводле БЕЛТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ПОЛЬШЧА ХОЧА АТРЫМАЦЬ АД ГЕРМАНІІ БОЛЬШ ЯК 500 МЛРД ДОЛАРАЎ ЗА ШКОДУ Ў ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ

**Кіраўнік камісіі па рэпарацыях сейма Польшчы Аркадыўш Мулярчык падчас выступлення ў парламенце паведаміў, што ўлады Германіі абавязаны выплаціць палякам больш за $543 млрд кампенсацыі за шкоду, нанесеную краіне Трэцім рэйхам у гады Другой сусветнай вайны. Пра гэта паведамляе выданне Dziennik.**

Паводле яго дэпутата, у 1990 годзе сума рэпарацый складала $284 млрд, але калі ўлічыць пакупную здольнасць долара ў 2017 годзе, то атрымаецца сума ў $543 мільярды. Мулярчык падкрэсліў, што ад рук фашыстаў пацярпелі больш за 13 млн палякаў. Кіраўнік камісіі адзначыў, што кампенсацыя ад Германіі «па праве належыць польскім грамадзянам». «Пераважная большасць ахвяр ужо памерла, большасць з іх ніколі не атрымала ніводнай маркі, долара ці злотага ад Германіі», — сказаў палітык.

Мулярчык падкрэсліў, што дамагчыся рэпарацый ад Германіі больш рэальна, чым ад Расіі. Па словах палітыка, у Расіі «не выконваюць міжнародныя правы». Кіраўнік МЗС Польшчы Вітальд Вашчыкоўскі восенню 2017 года заяўляў, што краіна прааналізуе пытанне атрымання рэпарацый ад Масквы за «шкоду, прычыненую Чырвонай арміяй у гады Другой сусветнай вайны».

## КАНГРЭСМЕНЫ ЗША ЗАЦВЕРДЗІЛІ 620 МЛН ДОЛАРАЎ НА ДАПАМОГУ УКРАІНЕ

**Як вынікае з кансалідаванага закона аб бюджэтных асігнаваннях, 200 млн долараў будуць пералічаныя на ваенныя патрэбы Кіева, яшчэ звыш 420 млн — на фінансавую падтрымку.**

Выдзяленне сродкаў прапісана ва ўзгодненым членамі рэспубліканскай і дэмакратычнай партый кансалідаваным законе аб бюджэтных асігнаваннях, тэкст якога быў адобраны 21 сакавіка.

Як вынікае з дакумента, «на ініцыятыву па падтрыманні бяспекі Украіны» па лініі Пентагона выдзяляецца 200 млн долараў. Гэтая сума пойдзе на падрыхтоўку ўкраінскіх ваенных, закупку абсталявання і «лятальных узбраенняў абарончага характару», падтрыманне работы разведслужбаў краіны і лагістычнае забеспячэнне.

У снежні 2017 года адміністрацыя прэзідэнта ЗША адобрыла першыя камерцыйныя пастаўкі лятальнай абарончай зброі ўкраінскай арміі. У прыватнасці, былі дазволены пастаўкі снайперскіх вінтовак мадэлі M107A1. Тады ж з'явілася інфармацыя аб тым, што Трамп мае намер ухваліць пастаўкі ва Украіну і комплексаў Javelin.

## САМІТ ЕС НЕ ПРЫНЯЎ ПРАКТЫЧНЫХ МЕР СУПРАЦЬ РАСІІ ПА СПРАВЕ СКРЫПАЛЯ



«Саміт ЕС у самай катэгарычнай форме асуджае нядаўнюю атаку ў Солсберы, выказвае самыя глыбокія спачуванні ўсім тым, чые жыцці падвергліся рызыцы, і прапануе дапамогу ў расследаванні інцыдэнту. Саміт ЕС надзвычай сур'ёзна ўспрымае ацэнку ўрада Злучанага Каралеўства, што адказнасць з высокай імавернасцю нясе Расійская Федэрацыя і няма альтэрнатыўнага праўдападобнага тлумачэння», — гаворыцца ў выніковай заяве.

«Выкарыстанне хімічнай зброі, уключаючы выкарыстанне любых таксічных рэчываў у якасці зброі, пры любых абставінах цалкам непрымальнае, павінна сістэмна і строга асуджацца і ўяўляе небяспеку для ўсіх нас», — адзначаецца ў тэксце.

Краіны ЕС дамовіліся каардынаваць свае дзеянні па магчымых наступствах у святле адказу, які пададуць расійскія ўлады.

■ Блізкая ўлада

# І СКАРГІ, І ПАДЗЯКІ

### выслухаў падчас прамой тэлефоннай лініі старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК



Фота БЕЛТА.

**Яму патэлефанавалі 26 чалавек. Большасць з іх цікавіла, якім чынам будуць рамантавацца дарогі, пашкоджаныя гэтай зімой. Надвор'е дадало нехарактэрныя для гэтай пары года пытанні па прыборцы лёду і снегу з дваровых тэрыторый, у тым ліку ў абласным цэнтры.**

Прынамсі, жыхар Гомеля Мікалай Васькоў прасіў звярнуць увагу на вуліцы Магілёўскую і Братоў Лізюковых. Прэс-сакратар аблвыканкама Вольга Рабікава расказала, што губернатар запэўніў: як толькі сыдуць маразы, будзе праведзены маніторынг транспартных артэрый. Іх пачнуць аператыўна прыводзіць у належны стан.

Не абышлося без прэтэнзій у адрас жыллёва-эксплуатацыйных службаў. Жыхарка Гомеля Валянціна Стрынгель паскардзілася на істотнае парушэнне тэмпературнага рэжыму ў кватэры. Па даручэнні Уладзіміра Дворніка пытанне будзе вырашана ў самыя сціслыя тэрміны.

Шматдзетная мама з Жыткавіч прасіла звярнуць увагу на неабходнасць яшчэ аднаго пешаходнага пераходу ў раёне школы, дзе вучацца яе старэйшыя дзеці, а матуля з Навабеліцкага раёна абласнога цэнтра папрасіла падоўжыць рэжым работы дзіцячага садка, бо яна не паспявае забіраць сваіх дзяцей без парушэння графікаў работы дзіцячых устаноў. Губернатар даў даручэнні кіраўнікам адпаведных абласных службаў вывучыць пытанні і выканаць абгрунтаваныя просьбы.

Працаўладкаваннем дачкі занепакоена жыхарка Буда-Кашалёўскага раёна Ганна Краснікова. Дзяўчына атрымала дыплом эканаміста і хоча працаваць у сельскай гаспадарцы. Уладзімір Андрэевіч даручыў высветліць, якія вакансіі можна прапанаваць маладому спецыялісту.

Сярод званкоў, што паступілі падчас кантактавання старшыні аблвыканкама з жыхарамі Гомельшчыны, былі прапановы па ўдасканаленні працы ЖКГ, сістэмы аховы здароўя і нават пераглядзе коштаў на сельскагаспадарчую тэхніку «Гомсельмаша» ў бок павелічэння.

З падзякай за рэалізаваны праект па водазабеспячэнні звярнуліся да Уладзіміра Дворніка жыхары мікрараёна Касцюкоўка абласнога цэнтра. Губернатар адзначыў, што тэма якаснага водазабеспячэння населеных пунктаў рэгіёна застаецца на яго асабістым кантролі і будзе планамерна рэалізоўвацца.

Звяртаючыся да прадстаўнікоў упраўленняў і камітэтаў аблвыканкама, гаррайвыканкамаў, губернатар адзначыў, што работа са зваротамі грамадзян патрабуе асабістай адказнасці і суперажывання.

— Не трэба закрываць вочы на наяўныя праблемы, адкладаць іх рашэнне на потым. Бяда пачынаецца з абыякавасці, а любая складаная сітуацыя — гэта выпрабаванне для кожнага з нас. Гэта — тое, што дазваляе вызначыць ступень нашай прафесійнай кампетэнтнасці.

Уладзімір Дворнік таксама падкрэсліў, што да рашэння спрэчных пытанняў неабходна больш актыўна прыцягваць прадстаўнікоў дэпутацкага корпуса ўсіх узроўняў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ** ■

## ПРАМАЯ ЛІНІЯ З МІНІСТРАМ ПРАЦЫ І САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ

**Сёння з 9.00 да 12.00 адбудзецца прамая тэлефонная лінія з міністрам працы і сацыяльнай абароны Ірынай Анатолеўнай КАСЦЕВІЧ.**

Па тэлефоне (017) 309 9 333 вы можаце задаць сваё пытанне міністру, а таксама падзяліцца сваім меркаваннем, выказаць прапановы па актуальных пытаннях сацыяльна-працоўнай сферы.

У адпаведнасці з заканадаўствам пры вашым звароце на прамую тэлефонную лінію ў вас спытаюць прозвішча, імя і імя па бацьку, даныя аб месцы жыхарства (месцы знаходжання), а таксама нумар кантактнага тэлефона.

**Святлана БУСЬКО.**

КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» сообщает, что **10 апреля 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1** состоится **повторный аукцион** по продаже имущества **открытого акционерного общества «Гроднопромтехника»:**

комплекс зданий, сооружений и оборудования, включающий 17 капитальных строений (административное здание с ограждением, асфальтобетонным, бетонным, плиточным покрытиями, диспетчерская-проходная, бытовка для охраны, склад запчастей-мастерская, арочный гараж, арочный склад, склад, производственный корпус, административное здание, склад полигона ЖБИ, котельная с пристройками, гаражи, арочный гараж, мойка автомобилей с пристройками, склад-костел, отстойники, уборная, КНС, канализационную сеть, водопроводную сеть, зеленые насаждения, ограждения, расположенного по адресу: **г. Гродно**, **ул. Понемуньская, д. 20** на земельных участках с кадастровыми номерами **422000000009003371** площадью **4,1540** га и **422000000009007250** площадью **0,0024** га.

Начальная цена продажи – **1 659 836,24 рубля,** сумма задатка – **165 983,63 рубля.**

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 403, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **по 4 апреля 2018 года.**

Телефоны для справок в Гродно: (0152) 742095, 720546, 720537.

Адрес сайта: **www.grodno.gov.by** УНП 590727594

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# «Заставацца на вастрыні часу»



**Раіса Хвір з Нясвіжа** выпісвае «Звязду» з пачатку 2000-х. Адметна, што яна сама мае дачыненне да журналістыкі: 37 гадоў працавала ў раённай газеце — спачатку карэспандэнтам, пасля загадчыкам аддзела. На заслужаным адпачынку Раіса Нікадзімаўна працягвае супрацоўнічаць з гэтым выданнем, акрамя таго, спявае ў хоры ветэранаў працы пры раённым Доме культуры і актыўна ўдзельнічае ў яго выязных выступленнях, а таксама чытае нашу газету.

— «Звяздзе» аддаю перавагу, бо яна на роднай мове. У нас няшмат выданняў пішуць па-беларуску, а мову, я лічу, трэба шанаваць і захоўваць. Яшчэ адна адметная рыса газеты — інфарматыўнасць. У кожным нумары шмат навін, прычым самых разнастайных. Добра, што ёсць рубрыка «Што ў свеце робіцца» аб міжнародным жыцці. Так што пра ўсе актуальныя падзеі з жыцця нашай краіны і свету я даведваюся найперш са «Звязды». А ўвогуле ў газеце заўсёды можна знайсці нешта цікавае. Я абавязкова чытаю рубрыкі «Жырандоля» і «Ігуменскі тракт». Цікавай атрымліваецца і «Сямейная газета». Заўсёды чытаю інтэрв'ю з медыйнымі персонамі. Вось нядаўна было надрукавана інтэрв'ю са Станіславам Ліпскім, тэлевядучым на канале «Беларусь 1». Вельмі цікавы малады чалавек, які ўсяго ў сваім жыцці дасягнуў самастойна, дзякуючы свайму характару. Гэта матывацыйная гісторыя для нашай моладзі. На мой погляд, такія прыклады заўсёды павінны быць у газеце.

Падабаецца, што ў «Звяздзе» ёсць і шмат карыснай інфармацыі: прагноз надвор'я, каляндар, сканворды, гараскоп для тых, хто цікавіцца. Вельмі зручна, што ёсць анонсы тэлефільмаў, — адразу ведаеш, што можна паглядзець. Заўсёды чытаю анекдоты. Гумар у нашым жыцці надзвычай важная рэч, таму хацелася б, каб газета пра гэта не забывалася.

Добра, што ў нас ёсць родная газета на роднай мове, і надалей я жадаю ёй заставацца на вастрыні часу.

❍ **Падпіска-2018**

### Сустрэнемся ў Мсціславе

**У аўторак, 27 сакавіка, на Мсціслаўскім цэнтральным гарадскім аддзяленні сувязі пройдзе Дзень падпісчыка газеты «Звязда». Кожны, хто аформіць падпіску на ІІ квартал, атрымае падарунак ад рэдакцыі. Чакаем усіх па адрасе: г. Мсціслаў, вул. Пралетарская, 61 27 сакавіка з 9 да 12 гадзін. Прыходзьце, будзе цікава!**

# МАЛОЧНЫ ПАТОК З ГАРАНТЫЯЙ

## Як у Гродзенскай вобласці дбаюць пра якасць малака

Кіраўнікі і спецыялісты сельскагаспадарчай галіны паглядзелі, як на практыцы забяспечваецца якасць прадукцыі на ўсіх этапах. Важнасць гэтай тэмы абумоўлена высокім эканамічным эфектам малочнай галіны як на айчынным, так і на замежных рынках. Падчас семінара было падкрэслена, якія рэзервы трэба задзейнічаць, каб дасягнуць высокай планкі ў вытворчасці малака і гарантаваць яго якасць.

### Адкуль ідзе вялікае малако

Малочнатаварны комплекс «Янава» ўступіў у строй некалькі гадоў таму. Гэта адзін з тых аб'ектаў, якія будаваліся ў рамках дзяржаўнай праграмы згодна з указам Прэзідэнта. За чатыры гады ўдалося дасягнуць добрых вынікаў — сярэднегадавыя надоі на ферме склададуць 7,1 тыс. кг малака на карову. І гэты паказчык значна вышэйшы, чым у цэлым па гаспадарцы, адзначыў **старшыня ААТ «Хацькаўцы» Ваўкавыскага раёна Аляксандр ЖЫЛІНСКІ**. Больш як 90 % складае таварнасць малака. Гэта значыць, што столькі ідзе на рынак і, вядома, прыносіць прыбытак гаспадарцы.

Каб дабіцца высокай таварнасці, тут працуюць комплексна. Як адзначаюць спецыялісты, шукаць малако ў дальніх залахужо позна, гэта трэба пачынаць з умоў утрымання жывёлы. Кароў трэба больш пускаць на выпас, каб яны больш знаходзіліся ў прыродных умовах. Вельмі важна, каб карова не дыхала аміякам, не атручвала свой арганізм і не хварэла. На ферме прымаюцца меры па прафілактыцы мастытаў. Вядзецца работа па недапушчэнні кетозаў — парушэнняў абмену рэчываў, што выклікае захворванні тых ці іншых органаў. Бо малако ад хворай каровы проста не прымуць на перапрацоўку. Кантроль за якасцю пачынаецца з фермы і праходзіць яшчэ некалькі этапаў, пакуль малако трапіць да спажыўца ў выглядзе гатовай прадукцыі.

### Стаўка на давер

Малако з фермы «Янава» вязуць на ваўкавыскае прадпрыемства «Беллакт». Тут кожная цыстэрна праходзіць дэзынфекцыйны бар'ер і абмываецца зверху спецыяльнай палівачнай сістэмай. Пасля гэтага малако трапляе на праверку ў лабараторыю. Удзельнікі семінара маглі назіраць, як лабарант правярае пломбы на люках цыстэрнаў, а затым кіроўца здымае іх. Пробы на аналіз бяруцца з кожнага люка, прычым аб'ём іх павінен быць не менш за адзін літр. Усе ёмкасці адпраўляюцца ў лабараторыю, дзе праходзяць кантроль у адпаведнасці з нарматывамі і тэхнічным рэгламентам бяспекі малака.

### Стратэгія — якасць малака

Удзельнікі семінара ўпэўніліся — бяспекі ў вытворчасці малака можна дабіцца пры цесным узаемадзеянні перапрацоўчых прадпрыемстваў і сыравіннай зоны. «Важна даць на ўзбярэнне веды, вопыт, навыкі, каб людзі не здзяйснялі правапарушэнняў у гэтай галіне», — адзначыў **старшыня Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці Анатоль ДАРОЖКА.**

**У тэму:** Рэкордную планку ў 10 тысяч кілаграм малака ад каровы мяркуюць дасягнуць сёлета СВК імя Дзяншчыкова і «Свіслач» Гродзенскага раёна. Абедзве гаспадаркі з'яўляюцца лідарамі па надоях малака ў Гродзенскай вобласці. Пры гэтым «Свіслач» здае на камбінат гатункам экстра 97,7 % малака.

Практыка-арыентаваны семінар якраз з ліку такіх прафілактычных мерапрыемстваў, дзе прадэманстраваны шляхі павышэння якасці і бяспекі малочнай прадукцыі па ўсім ланцужку вытворчасці. Калі адно звяно дасць збой, гэта адаб'ецца на канчатковым выніку. І малако будзе мець ніжэйшы гатунак і, адпаведна, ніжэйшы кошт. У Гродзенскай вобласці, напрыклад, стаіць задача атрымаць 60 % малака гатункам экстра. У многіх гаспадарках Гродзенскай вобласці гэты паказчык значна вышэйшы, а на ферме «Янава» ён складае 94 %. **Міністр сельскай гаспадаркі Леанід ЗАЯЦ** высока ацаніў тэхналогіі і падыходы да бяспекі малака на комплексе. «У свеце шмат розных методык вызначэння шкодных рэчываў — антыбіётыкаў, саматычных клетак. На гэтай ферме ўжываюць спосабы, даступныя для кожнай фермы, каб у кароткія тэрміны забяспечыць кантроль якасці прадукцыі», — падкрэсліў міністр.

Аб актуальнасці гэтага кірунку сведчыць і высокі экспартны патэнцыял. Планы паставак малака за мяжу з кожным годам павялічваюцца. І ў 2019-м трэба рэалізаваць на экспарт 5,8 млн тон, што амаль на 2 млн тон больш, чым летась. Самы выгадны партнёр — Расія. Таму гэты рынак вельмі важна ўтрымаць.

«Мы вядзём падрыхтоўку да гэтага яшчэ з мінулага года, — растлумачыў Леанід Заяц, — і маем намер спалучыць нашы электронныя сертыфікаты з расійскімі. Для гэтага спецыялісты ветэрынарнага нагляду Беларусі працуюць у цесным кантакце з расійскімі адпаведнымі службамі, каб забяспечыць суправаджэнне нашай прадукцыі з дапамогай электронных ветэрынарных сертыфікатаў. Упэўнены, што з 1 ліпеня мы таксама ўвойдзем у гэту сістэму».

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

■ Здарэнне

### Перакуліўся аўтобус...

**У выніку начной аварыі ў Пскоўскай вобласці ў медустановы шпіталізаваны 11 грамадзян Беларусі.**

Па інфармацыі прэс-службы пасольства Беларусі ў Расіі, у Пскоўскай абласной клінічнай бальніцы знаходзяцца 9 беларускіх грамадзян, у дзіцячай абласной бальніцы — двое дзяцей. Аварыя адбылася ў 4.35 у Струга-Красненскім раёне. Сутыкнуліся турыстычны аўтобус, што належыць беларускай кампаніі «Еўратранс», які рухаўся з Беларусі ў Санкт-Пецярбург, і легкавы аўтамабіль. У аўтобусе знаходзілася 50 чалавек, у тым ліку 11 дзяцей.

**Сяргей РАСОЛЬКА** ■

■ Цэны

### ПАЛІВА: +1 КАПЕЙКА

**Сёння ў краіне чарговы раз падаражэла аўтамабільнае паліва. Паводле інфармацыі канцэрна «Белнафтахім», цэны на аўтамабільны бензін і дызельнае паліва з 24 сакавіка на аўтазаправачных станцыях павялічыліся на 1 капейку, або ў сярэднім на 0,76 %.**

Кошт 1 літра бензіну АІ-92-К5-Еўра складае 1,24 рубля, АІ-95-К5-Еўра — 1,32 рубля, ДТ — 1,35 рубля. Нагадаем, што ў краіне распрацаваны новы механізм змянення цэн на аўтамабільнае паліва. Карэкціроўкі цэн на нафтапрадукты адбываюцца ў залежнасці ад змены сітуацыі на нафтавым рынку. Варта адзначыць, што гэта ўжо чацвёртае павелічэнне цэн за год.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ** ■

# ПЕРАМОГА ДАШЫ Ў ЦЮМЕНІ

**У расійскай Цюмені праходзіць апошні этап Кубка свету па біятлоне сезона 2017/2018.**

У спрынтарскай гонцы Дар'я Домрачава закрыла ўсе дзесяць мішэняў на двух агнявых рубяжах і атрымала сваю чарговую перамогу. Другой стала фінка Кайса Мякярайнен, якой таксама ўдалося пазбегнуць памылак на стрэльбішчы, трэцяя — нарвежка Цірыл Экхаф. Адзначым, што тры апошнія спрынтарскія гонкі беларуска аказваецца на п'едэстале гонару, у дзвюх з іх Дар'я атрымала перамогі. Праўда, вікторыя не дапамагла Домрачавай выйграць малы Хрустальны глобус у гэтай дысцыпліне, трафей атрымала Анастасія Кузьміна са Славакіі.

Ірына Крыўко ўчора размясцілася на 27-м радку выніковага пратакола, Дзінара Алімбекава заняла 32-е месца, Надзея Скардзіна стала 44-й, Надзея Пісарава — 58-й.

У агульным заліку Кубка свету Дар'я знаходзіцца на трэцім месцы, дзякуючы ўчарашняй перамозе яна значна наблізілася да Анастасіі Кузьміной, якая займае першы радок, і Кайсы Мякярайнен, якая ідзе пакуль другой. Сёння адбудуцца мужчынская і жаночая гонкі пераследу, а 25 сакавіка — мас-старт.

Адзначым таксама, што ўчора адбылося ўручэнне малога Хрустальнага глобуса па выніках індывідуальных гонак Кубка свету, яго выйграла наша Надзея Скардзіна.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# Палажыць канец туберкулёзу

## Плануецца да 2030 года

**Сёння адзначаецца Міжнародны дзень барацьбы з туберкулёзам — па-ранейшаму адной з самых небяспечных інфекцыйных хвароб сучаснасці.**

Паводле даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, штогод толькі ў Еўрапейскім рэгіёне выяўляецца каля 290 тысяч новых выпадкаў гэтай хваробы, а больш за 25 тысяч чалавек памірае. Аднак перамагчы гэту хваробу ва ўсім свеце плануецца да 2030 года.

У Беларусі летась выяўлена каля 2300 тыс, хто захварэў. Усяго ж на ўліку медыкаў знаходзіцца каля 5 тысяч чалавек. Паводле інфармацыі **галоўнага пазаштатнага фтызіятра Міністэрства аховы здароўя, дырэктара РНПЦ пульманалогіі і фтызіятрыі Генадзя ГУРЭВІЧА**, за апошнія гады захворванне зніжаецца: яшчэ восем гадоў таму штогод выяўлялася каля пяці з паловай новых выпадкаў туберкулёзу. За апошнія 10 гадоў захворванне знізілася больш, чым на 40 %, а смяротнасць — на 60 %.

Дзякуючы падтрымцы Глабальнага фонду наша краіна сярод лідараў па лячэнні прэпаратамі найноўшага пакалення. Як паведаміў **кіраўнік краінавага офіса Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Беларусі Батыр БЕРДЫКЛЫЧАЎ**, да 2019 года імі плануецца цалкам забяспечыць усіх хворых з множнай лекавай устойлівасцю. Даступнай стала і хуткасная дыягностыка.

**Алена КРАВЕЦ.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает об открытом аукционе по продаже здания склада, Минская обл., Воложинский р-н, Воложинский с/с, д. Гончары**

Лот № 1. Склад с инв. № 632/С-16555. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Г. п. – 1982; этажность – 1; общая площадь – 513 кв. м.

**Начальная цена продажи – 49 140,00 бел. руб.**
**Задаток – 4910,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ

Земельный участок с кадастровым номером 622081704101000097, расположенный по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, пер. Колхозный, 11, пл. 3,9592 га. Назначение – земельный участок для содержания и обслуживания строений и сооружений производственной базы. Право постоянного пользования. На земельном участке находятся иные объекты, не выставляемые на аукцион. Земельный участок делимый. Формирование отдельного земельного участка под Объект недвижимости осуществляется Победителем аукциона (Претендентом на покупку) самостоятельно. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

ОБРЕМЕНЕНИЯ

Арест. Постановление ИМНС Республики Беларусь по Воложинскому району от 21.03.2017 № 000146. Арест будет снят в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь после реализации Объекта с публичных торгов (торгов)

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем аукциона (Претендентом на покупку) может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен, но не более чем на 20 рабочих дней.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество должника, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 25.04.2018 г. в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X.

Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Склад) (Лот № 1), проводимом 25.04.2018 (Молодечненский МРО).

Организация и проведение аукциона, а также оформление и регистрация сделки осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 23.04.2018 в 11.00.

Все желающие могут ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Спичек Алексей Александрович, тел. +375 29 163-16-63

**Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by**

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 3 (78)

■ Профі

# КАЛІ АДЛІК ІДЗЕ НА СЕКУНДЫ

**Летась увесну з Віцебшчыны прыйшла трывожная навіна. Падчас дэсантавання з самалёта Іл-76МД з-за парыву ветру небяспечна сышліся ў паветры два парашуты. На вышыні прыкладна 80 метраў сутыкнуліся ваеннаслужачыя 38-й асобнай гвардзейскай дэсантна-штурмавой брыгады радавы Яўген Жарскі і Дзмітрый Страчук. У Яўгена Жарскага тут жа згас купал. Але яго саслужывец не разгубіўся. Ён схапіў згаслы купал і ўтрымліваў яго, як мог, ажно да прызямлення. На жаль, крыху не хапіла — дзесьці з вышыні чацвёртага паверха Яўген упаў на зямлю... Жыццё хлопцу ўратавала начальнік шпітальнага аддзялення медыцынскай роты гвардыі капітан медыцынскай службы Таццяна АКСІНУШКІНА.**

***— Вы памятаеце той дзень?***

— Гэта быў пачатак красавіка. Ішлі міжнародныя вучэнні. Адным з іх элементаў было здзяйсненне скачкоў з грузавога транспарту. Надвор'е стаяла цёплае, сонечнае. У адваротным выпадку скачкі не адбыліся б. І вось нічога ж не прадвяшчала бяды. Пэўна, хлопцу яшчэ пашанцавала, што травы тады асабліва не было. Затое бруду было па калена. Можа, гэта ў пэўнай ступені і аслабіла ўдар аб зямлю.

На вучэннях быў разгорнуты медыцынскі пункт. Але ж ад яго яшчэ трэба было паспець дабегчы! А я ж бачыла, што пацярпелых двое. І вось каму раней трэба дапамагаць? Бягу і бачу — адзін з парашутыстаў падняўся. Крычу яму: «Ты як там сябе адчуваеш? Нармальна?» Ён адказвае: «Так, а вось ён без прытомнасці ляжыць...»

Пры першасным аглядзе Яўген Жарскі быў без прытомнасці, дыхання і біцця сэрца. Мне давялося праводзіць штучную вентыляцыю лёгкіх і непрамы масаж сэрца. А яшчэ імабілізаваць нагу, бо было падазрэнне на пералом канечнасці, якая знаходзілася ў няправільным становішчы. Не перадаць таго адчування, калі хлопец пачаў дыхаць... Я працавала з ім літаральна хвілін пятнаццаць. Трэнінгі па аказанні неадкладнай дапамогі праводзяцца ў нас рэгулярна, мы адпрацоўваем магчымыя няшчасныя сітуацыі на трэнажорах, але каб сабе ўявіць такое — то гэта нешта па-за межамі... Хлопец зрабіў удых, выдаў працяжны гук. Ведаеце, як дзеці нараджаюцца, пасля яны крычаць. Тое ж адбылося і тут — ён з шумам уцягнуў паветра, ачомаўся, пачаў нешта казаць, назваў сваё імя. Калі яго вярнулі да жыцця, то першае, што ён вымавіў даволі жаласным тонам, было — «Хачу курыць!» На санітарным аўтамабілі яго тады перапраўлелі ў Шумілінскую раённую бальніцу. На карысць хлопца было тое, што ад моманту атрымання траўмы прайшло вельмі мала часу, і дапамогу



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

яму аказалі літаральна па гарачых слядах. Яму настолькі пашанцавала... Пасля ў Шуміліна прылецеў санітарны верталёт, які даставіў радавога ў Ваенны шпіталь да высакакласных спецыялістаў.

Пасля я тэлефанавала ў шпіталь, цікавілася станам яго здароўя. Думала, што на аднаўленне здароўя яму спатрэбіцца шмат часу. Але, на шчасце, памылілася. Ведаю, што зараз ён звольніўся з арміі і працуе ў Баранавічах на заводзе аўтаматычных ліній — там, дзе быў і да прызыву ў войска. Сваю ролю, пэўна, адыграла і маладосць. Да таго ж у дэсантнікі так проста не трапіць — адбор туды па здароўі вельмі жорсткі.

***— Чаму абралі менавіта ваенную медыцыну?***

— Я — першы ў сям'і медык. Хутчэй за ўсё, на гэты выбар аказаў уплыў мой юнацкі максімалізм. Вельмі хацелася дапамагаць людзям. Я нарадзілася ў вёсцы Бачэйкава Бешанковіцкага раёна ў звычайнай сялянскай сям'і. Вучылася на ўрача ў Віцебску.

***— Ваенная медыцына і грамадзянская — чым адрозніваюцца?***

— У нас адлік ідзе на секунды. Трэба аказваць дапамогу на месцы. Можна нават сказаць, што наша праца чымсьці падобна да працы ўрача хуткай медыцынскай дапамогі. Усё, што ў цябе ёсць, — сумка і багаж ведаў. Медыцынская сумка камплектуецца па ўстаноўленай інструкцыі. Там ляжаць прэпараты для аказання першай дапамогі. Візуальна яна яркая і падобная на чамаданчык урача «хуткай».

***— Ці наклала служба адбітак на паўсядзённае жыццё?***

— Перш за ўсё — гэта дысцыпліна. Усё павінна быць дакладна, па распарадку. Каб не давялося паўтараць два разы адно і тое ж. У мяне двое дзяцей. Дачка Жэня, якой 10 гадоў, ужо заявіла, што таксама хоча стаць ваенным урачом. А хлопчык, калі быў малы, апранаў фуражку таты і хадзіў з медыцынскай аўтамабільнай аптэчкай. І прадстаўляўся — «Я — медыцынскі спецназ!»

***— А вы самі робіце скачкі з парашутам?***

— У мяне іх больш за два дзясяткі. Канешне, страх вышыні прысутнічае. Гэта нармальная абаронча рэакцыя арганізма. Я ведаю людзей, у каго 100 і больш скачкоў, і пэўнае пачуццё страху ў іх ёсць. Але ў мяне дысцыпліна змагаецца са страхам. Трэба браць сябе ў рукі і выконваць тое, што ад цябе патрабуецца.

***— Вы памятаеце ваш першы скачок?***

— Цьмяна. Тады было страшна першы раз выходзіць з парашутам у люк самалёта. Другі — таксама. А каму не страшна? Але ў маладосці ты не задумваешся. Хочаш паспрабаваць свае магчымасці, пераадолець сябе. А пасля прыходзіць усведамленне таго, што ты робіш. Я ж баявы афіцэр-урач, а не выключна кабінетны супрацоўнік.

***— А ці працуюць у вас урачы ва ўзросце?***

— Так, ёсць грамадзянскі лорурач. Вельмі дасведчаны, заўжды кансультуюся з ім, калі ўзнікаюць нейкія пытанні. Працоўны дзень у медыцынскай роце — такі ж, як і ў грамадзянскай бальніцы. Вось толькі ў дактароў ёсць дадатковая падрыхтоўка — і інжынерная, і страявая, і паветрана-дэсантная... Агулам у нас восем ваенных і чатыры грамадзянскія ўрачы. Але калі, напрыклад, адбываюцца вучэнні, то ўсе ваенныя ўрачы едуць туды. Калектыў у нас дружны, усе супрацоўнікі ўзаемазамяняльныя.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

■ Боегатоўнасць

## У войска прызваны 50 жанчын

**Ва Узброеных Сілах адбываецца маштабная комплексная праверка баяздольнасці. На гэтым тыдні падраздзяленні Ваенна-паветраных сіл і войскаў процівпаветранай абароны здзейснілі маршы ў прызначаныя раёны і заступілі на баявое дзяжурства. Авіяцыі пастаўлены задачы размеркаваць частку сіл і сродкаў. А радыёлакацыйнае поле ўзмоцнена дзеяннямі рухомых малавышынных радыёлакацыйных груп.**

Нагадаем, што павесткі на зборы атрымалі каля дзвюх тысяч ваеннаабавязаных. Але ў гэтым ліку не толькі мужчыны.

— Адметнасцю гэтай праверкі стала тое, што на зборы прызвана каля 50 ваеннаабавязаных жанчын, якія маюць адпаведныя ваенна-ўліковыя спецыяльнасці, — паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе Міністэрства абароны. — Раней іх прызывалі або ў значна меншай колькасці, або не прызывалі зусім. Павесткі атрымалі пераважна жанчыны, якія працуюць у медыцынскай сферы.

З асабовым складам, які быў прызваны з запасу, праводзяцца заняткі па прадметах баявой падрыхтоўкі. Акрамя таго, іх чакае комплекс мерапрыемстваў па падрыхтоўцы месцаў правядзення баявога зладжвання і вучэбна-матэрыяльнай базы для заняткаў.

А ўчора словы на вернасць Айчыне вымавілі ваеннаабавязаныя, якія дагэтуль не прымалі прысягу.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

■ Спецыяльны рэпартаж

# Падрыхтоўка асаблівага прызначэння

## Кіраўнікі вучыліся абараняць гарады

**На 230-м агульнавайсковым палігоне «Абуз-Лясноўскі» ў Брэсцкай вобласці напрыканцы лютага старшыні абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў і іх намеснікі, якія курыруюць пытанні тэрытарыяльнай абароны, ваенныя камісары штурмавалі раён дыслакацыі верагоднага праціўніка, стралялі і абараняліся.**



### СТРАЛЬБА І ТАКТЫКА

Пачалося мерапрыемства з «прыстрэлкі» шырокага арсенала зброі. Кіраўнікі абласцей вялі агонь са снайперскіх вінтовак, аўтаматаў, кулямётаў, пісталетаў, гранатамётаў. Не абмінулі і зброю Вялікай Айчыннай вайны: легендарных ППШ і маўзера — усяго таго, што можа быць «раскансерваванa» з глыбінь беларускіх сховішчаў для народнага апалчэння ў выпадку непрадбачаных абставін.

Пасля «стралковага разагрэву» ваенныя правялі заняткі з кіраўнікамі рэгіёнаў па тактыцы і каардынацыі дзеянняў тэрытарыяльнай абароны ў час ваеннага становішча. На мерапрыемстве прысутнічаў **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Беларусі генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ.** Ён адзначыў, што ўзровень разумення паміж Генеральным штабам Узброеных Сіл і органамі выканаўчай улады ў краіне вельмі высокі. «Яны актыўна ўзаемадзейнічаюць з намі ў аснашчэнні і закупцы новых сучасных сродкаў, у арганізацыі сістэмы кіравання. На высокім узроўні праходзяць вучэнні і трэніроўкі», — расказаў Алег Белаконеў.

Для Беларусі заўсёды была важная тэрытарыяльная абарона. Бо ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны краіну называлі «краем партызан». З тых часоў у пытаннях стварэння і развіцця сістэмы тэрытарыяльнай абароны беларусы займаюць аўтарытэтную пазіцыю. «Многія дзяржавы ў нас пераймаюць перадавы вопыт. Зборы са старшынямі аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама праводзяцца ўжо трэці год запар. Кожнае такое мерапрыемства накіравана на рашэнне пэўных пытанняў. На гэтых занятках мы разглядаем абарону горадоў. Старшыні выканаўчых камітэтаў маюць магчымасці разам са сваімі намеснікамі і ваеннымі камісарамі адначасова свае навыкі, не толькі ў стральбе, але і падчас заняткаў, дзе будуць паказаны абарона і штурм населенага пункта», — дадаў Алег Белаконеў.

### ШТУРМ!

Перад навучальным штурмам і абаронай імітацыйнага населенага пункта, які ваенныя пабудавалі яшчэ да мерапрыемства, губернатараў азнаёмілі з асаблівасцямі ўмацавання раёнаў, арганізацыяй побыту апалчэння і выкарыстаннем супрацьтанкавых і артылерыйскіх падраздзяленняў. Кіраўнікам выканкамаў прадэманстравалі прыклады інжынерных загарод, магчымыя варыянты татальнага мініравання будынкаў, далі пакаштаваць стравы салдацкай кухні. Пасля наведвання вучэбных кропак быў разыграны эпізод вядзення бою за ўтрыманне населенага пункта.

«Вопыт апошніх канфліктаў сёння паказвае, што ў абароне краіны прымаюць удзел не толькі рэгулярныя войскі, але і апалчэнне. Практычна ўсе краіны імкнуцца ствараць сілы тэрытарыяльнай абароны. Беларусь не з'яўляецца выключэннем. У далейшым спланаваны комплекс мерапрыемстваў з аналагічнай тэматыкай, толькі з прыцягненнем тэрытарыяльных войскаў у адным з раёнаў Брэсцкай вобласці ў чэрвені гэтага года. Будуць праводзіцца збор і камандна-штабное вучэнне менавіта па тэматыцы падрыхтоўкі і абароны гарадоў», — расказаў **начальнік упраўлення тэрытарыяльнай абароны — намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі палкоўнік Андрэй ПАСЕКА.**

Пасля невялікай «вайны» ўдзельнікі падвялі вынікі дня і намецілі далейшы план па сумеснай рабоце. Як адзначыў **старшыня Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта Анатоль ЛІС,** да ваенных задач трэба рыхтавацца ў мірны час, каб разумець, што рабіць у непрадбачаных абставінах. А для Брэстчыны гэта асабліва важна, бо яна з'яўляецца прыгранічнай вобласцю. «Тут старшыні выканкамаў удакладняюць задачы па тэрытарыяльнай абароне. Акрамя таго, мы лепш даведаліся, якое палітычнае становішча складваецца вакол Беларусі. Хачу адзначыць, што падрыхтоўка вядзецца сістэмна як на ўзроўні кіраўніцтва, так і з выкарыстаннем тэрытарыяльных войскаў вобласці», — рэзюмаваў Анатоль Ліс.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

Асоба

# У НЕБЕ — ПАКРЫШКІН!

**Споўнілася 105 гадоў з дня нараджэння выдатнага савецкага лётчыка, тройчы Героя Савецкага Саюза маршала авіяцыі Аляксандра Іванавіча Пакрышкіна.**



Аляксандр нарадзіўся ў Новамікалаеўску (цяпер горад Новасібірск) у беднай сям'і перасяленцаў з Вяцкай губерні. У кнізе «Пазнаць сябе ў баі» Пакрышкін успамінаў: «Дванаццацігадовым хлапчуком я ўпершыню ўбачыў агітсамалёт, які прыляцеў. Сярод усіх жыхароў горада, якія акружылі самалёт, стаяў і я... Пакратаў яго крылы і сам сабе сказаў: «Буду рабіць усё, але буду толькі лётчыкам». І гэтая мара стала мэтай майго жыцця». Пасля заканчэння сямі класаў Аляксандр навучаўся ў фабрычна-заводскім вучылішчы «Сібкамбайнбуда» па спецыяльнасці слесар-інструментальшчык. З чэрвеня 1932-га Пакрышкін у шэрагах рабоча-сялянскай Чырвонай арміі. У 1933—1934 гг. скончыў пермскую 3-ю ваенную школу авіяцыйных тэхнікаў і курсы ўдасканалення тэхнічнага складу ВПС РСЧА ў Ленінградзе. Са снежня 1934-га па лістапад 1938 года А. І. Пакрышкін — старшы авіятэхнік звяна ў 74-й стралковай дывізіі Паўночна-Каўказскай ваеннай акругі. У гэты ж час спасцігаў асновы лётнага майстэрства ў Краснадарскім аэраклубе ТСА АВІЯХІМ, скончыў усю лётную праграму з выдатнай адзнакай. У 1939 г. з выдатнай адзнакай скончыў 1-ю Качынскую Чырванасцяжную ваенную авіяцыйную школу імя А. Ф. Мяснікова і быў накіраваны малодшым лётчыкам у 55-ы знішчальны авіяполк ВПС Адэскай ваеннай акругі. Тут ён адзін з першых асвоіў новы знішчальнік МіГ-3, які паступіў на ўзбраенне палка.

Вялікую Айчынную вайну старшы лейтэнант Пакрышкін сустрэў на заходніх межах нашай Радзімы на пасадзе намесніка камандзіра эскадрыллі 55-га знішчальнага авіяцыйнага палка ВПС Паўднёвага фронту. Ужо на другі дзень вайны ён адкрывае лік сваім будучым шматлікім перамогам, падбіўшы ў паветраным баі варожы знішчальнік Ме-109. На працягу наступных месяцаў у паласе дзеяння Паўднёвага фронту адважны лётчык збівае яшчэ некалькі самалётаў праціўніка, актыўна ўдзельнічае ў штурмоўках і вядзенні паветранай разведкі. Усе свае нязнанні і разважанні ён заносіў у асаблівы сшытак, назваўшы яго «Тактыка знішчальнікаў у баі». У ім Аляксандр Іванавіч распрацаваў шмат новых тактычных прыёмаў, якія атрымалі шырокае распаўсюджанне ў савецкай авіяцыі ў гады вайны.

Напярэдадні 1942 года Аляксандру Пакрышкіну ўручаны ордэн Леніна. Ва ўзнагародным лісце было агучана: «Карыстаецца выключным аўтарытэтам і павагай сярод падначаленых і ўсяго лётнага складу палка. Мужна выконвае баявыя заданні па знішчэнні нямецкіх захопнікаў. У барацьбе з гэтымі катамі тав. Пакрышкін у няроўных паветраных баях быў двойчы збіты... Мае 190 баявых вылетаў... Адзін з найлепшых разведчыкаў у палку і дывізіі». У жніўні 1942 г. полк, які стаў да таго часу 16-м гвардзейскім, пасля найцяжэйшых баёў быў адведзены ў тыл для перавучвання на новую тэхніку — пастаўленыя ў СССР па ленд-лізе амерыканскія знішчальнікі Р-39 «Аэракобра».

Аляксандр Пакрышкін у красавіку 1943 года вяртаецца на фронт, удзельнічае ў паветранай бітве на Кубані. Менавіта тут, на Кубані, нарадзілася знакамітая формула Пакрышкіна «вышыня, хуткасць, манеўр, агонь» і ўзышла зорка аднаго з самых доблесных савецкіх лётчыкаў. У адным са сваіх баёў ён на вачах у камандуючага ВПС фронту генерал-лейтэнанта Вяршыніна збіў чатыры «Месершміты». За гэты поспех лётчык узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Праз некалькі тыдняў імя Пакрышкіна ўжо гучала ў франтавой і цэнтральнай прэсе. За шматлікія перамогі ў небе над Кубанню камандзір эскадрыллі 16-га гвардзейскага знішчальнага авіяцыйнага палка 216-й змешанай авіяцыйнай дывізіі 4-й Паветранай арміі Паўночна-Каўказскага фронту гвардыі капітан Пакрышкін 24 мая 1943 г. быў уганараваны звання Героя Савецкага Саюза.

Падчас лютых паветраных бітваў у поўнай меры выявілаецца талент лётчыка-знішчальніка — наватара тактыкі паветранага бою. Аляксандр Іванавіч першы стаў шырока выкарыстоўваць баявы парадак пад назвай «кубанская этажэрка» і спрыяў яго ўкараненню ва ўсіх падраздзяленнях знішчальнай авіяцыі. Ім таксама былі выкарыстаны новыя прыёмы паветранага бою: «нажніцы», «сакаліны ўдар», «абцугі», «арэлі», «бай на вертыкалях».

Адна з самых гучных легендаў Вялікай Айчыннай: варта было з'явіцца ў небе лётчыку-знішчальніку, як тут жа ў эфіры раздавалася папярэджанне «Ахтунг, ахтунг, у паветры Пакрышкін!», і нямецкія асы тут жа спяшаліся выйсці з бою. А савецкія лётчыкі па-забіяцку выконвалі песню пра героя-аднапалчаніна кампазітара В. Панамарова на словы паэта М. Марчанкі:

*В небе Покрышкин!*
*В небе Покрышкин!*
*Будто бы пишет*
*по небу крылом.*
*Сердцем отважным*
*он Родину слышит*
*И на врага налетает*
*орлом.*

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 24 апреля 2018 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 26.03.2018 по 20.04.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017) 203-94-15 (учреждение «Дирекция по управлению собственностью Федерации профсоюзов Беларуси»)

■ Выстава

# ДУХМЯНЫ ЖЫВАПІС, альбо Як намаляваць пах кавы?

**Жывапіс са смакам кавы. Менавіта так можна ахарактарызаваць праект студэнткі Акадэміі мастацтваў Алесі Ісы, прадстаўлены ў сталічнай кавярні «Guru Coffee Club». Выбар прасторы невыпадковы: канцэптуальны праект аб'яднаў партрэты сталічных барыстаў. Праз іх вобразы мастачка паказвае, што гэтая праца — сапраўднае чараўніцтва, працэс, што чапляе візуальнай эстэтыкай і нават пахам.**

Усе героі — людзі творчыя і тэмпераментныя, што адлюстравана ў карцінах. Яны аб'яднаны залатымі тонамі. Менавіта гэты колер асацыюецца з духмянай кавай. Работы поўняцца гарманічнымі адценнямі і смелай пабудовай кампазіцыі.

— Я вельмі люблю піць каву. Заходжу ў кавярні практычна кожны дзень. У нейкі момант стала заўважаць, што ў іх працуюць вельмі цікавыя і прыгожыя людзі, — расказвае Алеся Іса. — Пераадолеўшы страх, у 2013 годзе я падышла да дзяўчыны, якая працавала ў кавярні недалёка ад майго дома і прапанавала ёй папазіраваць мне. Пасля гэта ператварылася ў традыцыю: я прыходжу ў кафэ, знаёмлюся з барыстам, запрашаю стаць мадэллю. Так у мяне нарадзіліся не толькі партрэты, але і добрыя чалавечыя стасункі з цікавымі людзьмі. У пачатку 2018 года я зразумела, што партрэтаў назапасілася шмат, вось і прыйшла ідэя аб'яднаць іх адной выстаўкай.

Але асновай для канцэпцыі праекта стала не толькі тэматыка, але і выбар месца для яго прадстаўлення: творца знайшла кавярню з неабходным для яе работ інтэр'ерам. Такім чынам сувязь паміж кавай, барыстам і кавярняй захавана. Наогул, гэта ўжо асобны трэнд, калі мастацтва выходзіць за межы выставачных пляцовак у памяшканні самай рознай функцыянальнай накіраванасці з вялікай колькасцю наведвальнікаў.

— Стала заўважаць, што ў галерэі, на вялікі жаль, ходзіць не так і шмат людзей. Вядома, ёсць тыя, хто прыходзяць мэтанакіравана, але як далучаць да мастацтва іншых? Зыходзячы з канцэпцыі сваіх твораў, я знайшла месца, у якім арганічна падала жывапіс. Мне захацелася, каб любы чалавек мог прыйсці, паглядзець работы, пракаментаваць, магчыма, пакрытыкаваць. Для самога гледача размяшчэнне карцін у кафэ таксама палягчае задачу: не трэба траціць грошы на квіткі, і ў зале, дарэчы, няма бязмежнай цішыні. Можна прыйсці ў кавярню на спатканне альбо на сустрэчу з сябрам і ў той жа час разам пазнаёміцца з жывапісам таго ці іншага мастака. Прыемнае з карысным.

Алеся Іса жадае атрымаць як мага больш водгукаў, каб зразумець, каму не творчасць цікавая, а каму ўвогуле не падабаецца.

— Я не баюся масавага густу. Мне нават цікава, як людзі з розных сфер будуць рэагаваць на маю творчасць. У любым выпадку глядацкі суд — гэта досвед, асабліва для маладога мастака, — падкрэслівае творца. — Насамрэч не так лёгка, будучы маладым творцам, заявіць пра сябе. Прызнаю, што магчымасць арганізацыі праектаў у масавых установах — шанц для маладых мастакоў прыцягнуць да сябе ўвагу. Прычым неабавязкова зацікаўліваць толькі жывапісам, можна рабіць, напрыклад, мастацка-музычныя вечарыны або праводзіць экскурсію па выстаўцы, распавядаючы аб стварэнні экспазіцыі, раскрываючы гісторыю месцаў, якія ў ёй фігуруюць. З аднаго боку, гэта прыемна і карысна мастаку, з другога — установа таксама ў плюсе: хтосьці ў любым выпадку застанецца выпіць кавы ці возьме кубак з сабой падчас агляду экспазіцыі.

Акрамя партрэтаў, на выстаўцы прадстаўлена і некалькі пейзажных твораў. Мастачка вырашыла разбавіць імі экспазіцыю, каб прадэманстраваць, што яна можа працаваць у розных жанрах. Дарэчы, творца актыўна цікавіцца гістарычнымі тэмамі. Неаднойчы пісала партрэты знакамітых беларускіх дзеячаў. Зараз мастачка вучыцца на шостым курсе Акадэміі мастацтваў па спецыяльнасці «Станковы жывапіс». Яе дыпломнай работай будзе партрэт прадзеда — знакамітага беларускага паэта Аркадзя Куляшова.

— Я вельмі спантанны чалавек, стварáю эмоцыі. Ніколі не магу прадказаць, што захачу напісаць у наступны момант, — дзеліцца



Алеся. — Сёння гэта барыста, заўтра можа быць князь Вітаўт. А калі зусім шчыра, то ўсе мае творы — зборны вобраз мяне самой. Уся мая сям'я вельмі творчая. Думаю, ад іх мне дасталася такая моцная энергетыка. Праз іх я заўсёды напаўняюся эмоцыямі. Калі выхоўваешся сярод музыкі, сярод літаратуры, фарміруешся дзякуючы гэтаму як асоба, не можаш уявіць сябе пасля без творчых складнікаў жыцця.

Мастачка ўпэўнена: калі бесперапынна жывеш сваёй справай, любіш яе, сам не заўважаеш, як табою пачынаюць цікавіцца. Наперадзе ў яе шмат задум, напрыклад, арганізаваць экспазіцыю партрэтаў дзеячаў культуры Беларусі.

**Вікторыя АСКЕРА**

■ На сцэне

# ЯК ПЯСОК СКРОЗЬ ПАЛЬЦЫ

## Кругазвароты часу ў родных дварах

**Пачаць варта са шчасця. Што гэта такое? Калі ў дзяцінстве ездзіш на веласіпедзе ды наўмысна зваліваешся ў лужыну; калі можна быць малпачкай ды лазіць па яблынях; калі катаешся на тарзанцы; калі скачаш у пясок... Але ведаеце, якое галоўнае шчасце? Мецъ дом. І ў гэтым выпадку дом — не бяздушная будыніна з дарагімі сэрцу сценамі. Дом — гэта пачуццё, калі хочаце, філасофія. Аб тым пісаў яшчэ Францыск Скарына, бо дом — такое «месца сілы», якое зберагае ўспаміны. Менавіта гэтую думку даносіць у спектаклі Маладзёжнага тэатра «Двор як натура, што сыходзіць» рэжысёр Таццяна Аксёнкіна.**

Спектакль паставілі па п'есе расійскага драматурга Алены Ісаевай (па некаторых звестках яна — ўраджэнка Вязнясенскага), і для рэжысёра, якая досыць часта стварае пастаноўкі для ненапружанага прагляду (хоць у яе скарбонцы ёсць і чароўны спектакль «Саня, Ваня, з імі Рымас»), «Двор...» — гэта спроба зрабіць простую, немудрагелістую гісторыю сапраўднай філасофскай прыпавесцю, якая б пакінула жаданне разважаць, а не была звычайнай забавай на адзін вечар. Увесь калектыў тэатра таксама працаваў — нездарма ж трупе Маладзёжнага далі званне «Заслужанага калектыву», якое акцёры цалкам апраўдваюць (чаго толькі вартая мужнасць адной з актрыс, якая іграла прэм'ерны спектакль са зламанай рукой). Артыстам было хоць і няпроста, але вельмі прыемна выконваць ролі: героі п'есы Ісаевай — гэта людзі, каштоўныя тым, што захоўваюць у сабе эпоху.

Саша-Пелікан (Яўген Іўковіч) цяпер ужо дарослы мужчына, нават паспяховы: жыве ў Аўстраліі, валодае землямі ў краіне кенгуру ды займаецца любімай справай — матацыкламі. Але яго маці захварэла, і ёй вельмі захацелася вярнуцца на радзіму, пабачыць, якой стала Масква за гэтыя доўгія гады яе адсутнасці. Калі герой-аўстраліец аказваецца ў сучаснай Маскве, ён ужо не мае гэтага адчування дому, які калісьці быў для яго ўсім: паўсюль гандлёвыя цэнтры, людзі спяшаюцца; машыны і хмарачосы. Але памяць па тое і існуе, каб захоўваць дарагія моманты і людзей, якія калісьці былі блізкімі. Так, Сашка сустракае свайго сябра дзяцінства Генку (Сяргей Шаранговіч) — каля месца, дзе калісьці знаходзіўся іх дом № 33 па вуліцы Зялёнай. З гэтага моманту пачынаецца падарожжа герояў ва ўспаміны, настальгія па былых сябрах ды каханых.

Таццяна Аксёнкіна паказвае сваіх герояў вельмі рознымі — часам наіўнымі, часам сур'ёзнымі, але ўсе яны вельмі чуллівыя, ім складана быць няшчырымі і хочацца быць шчаслівымі, і гэта тое, што персанажаў аб'ядноўвае. Дарэчы, дарослыя Сашка ды Генка — усяго толькі назіральнікі за тым, якімі яны былі ў мінулым. Вось ім па чатырнаццаць: Сашка пераязджае з сям'ёй у той самы 33-і дом на Зялёнай, знаёмства з Генкам пачынаецца з бойкі. Наогул, усё нейкае нешчаслівае: п'яны сусед, бабка Ліда, якая штораз нагадвае, што хлопца ў гэтым доме нічога добрага не чакае, дзедветэран, які штодня нагадвае пра перамогу ў вайне, самотная дзяўчына, якая будзе шукаць сабе мужа. Спектакль цікавы ўжо тым, што на пытанні дому, адносін, кахання адказы шукаюць адразу тры пакаленні людзей. Адказы ў іх будуць розныя.

Але ці не ў гэтым сэнс? У 14 дом — гэта толькі памяшканне, бацькі — людзі, якія не пускаюць на вечарынкі, каханне — бясклапотныя абяцанні «назаўсёды». У 40 усё змяняецца: дом становіцца сімвалам устойлівасці, утульнасці, бацькі займаюць меншае месца ў жыцці, а вось каханне — яго ці няма, ці яго шукаеш, ці бясконца змагаешся за яго. Напэўна, самыя шчаслівыя ў любоўным плане старыя: дзед Лёня ўгаворвае бабу Ліду раздзяліць з ім старасць, а яна не пагаджаецца, бо ў жыцці пабачыла рознага і цяпер не гатовая да такіх эксперыментаў. Часам ва ўсіх гэтых перыпетыях згадваюцца сюжэты п'ес Вампілава: гэткая ж «бытавуха», пачуццёвасць, складаныя адносіны, непаразуменні ды пошукі шчасця. Аксёнкіна ў спектаклі прасочвае цыклы жыцця і закальцоўвае іх (для гэтага на сцэне нават ёсць пляцоўка-кола, якая рухаецца разам з жыццём герояў), напаўняе жыццё герояў сэнсамі, шукае арыенціры, якія б адпавядалі ўзросту персанажаў. І шмат увагі ўдзяляе мінуламу, бо менавіта на ім усё завязана: усё цяперашняе жыццё — гэта люстра таго, што было калісьці; усе ўчынкі, якія былі зроблены ў дзяцінстве, цяпер справядліва адбіваюцца на чалавеку; усе правільныя і няправільныя рашэнні ўплываюць на тое, якім жыццём героі жывуць цяпер.

Двор у такім выпадку — гэта адначасова і проста дэкарацыя да разважанняў, і вельмі глыбокая рэч. Што тут ёсць? Колькі лавак, старое дрэва ды ўваход у пад'езд. Але калі задумацца, то менавіта тут прымаліся тыя самыя жыццеявырашальныя рашэнні, тут хлопцы ішлі сценка на сценку, тут Генка спрабаваў прызнацца ў каханні дзяўчыне, а Сашка маляваў партрэт свайго самага сапраўднага кахання Надзькі. У сінопсісе спектакля нездарма напісана, што двор — гэта філасофія. І гэта так, двор — навука, якая дае не толькі тэарэтычныя веды ад дзеда Лёні пра вайну ды ад бабкі Ліды пра забабоны, але і практычныя, якія пасля сфарміруюць характар жыхароў двара.

Часам дзіцячая наіўнасць персанажаў ды іх рашэнняў збівае гледача з панталыку: спектакль пачынае падавацца банальнай меладрамай з жартамі ніжэй за пояс ды наогул без глыбокіх думак, але менавіта складаная гісторыя, якую расказалі проста, дае больш важкі вынік: вялікае ў малым, трэба разумець гэта, калі вядзеш пошукі. Усе надзённыя рэчы, бытавыя дробязі, спрэчкі ды кінутыя проста так фразы маюць вялізнае значэнне ў глабальным плане. Вось пра гэта кажа неідэальны, немудрагелісты, але прыемны ды лёгкі «Двор...»: жыццё цячэ як пясок скрозь пальцы, таму моманты, нават самыя нязначныя, заўсёды маюць сэнс. Асабліва тыя, якія правёў у родным двары.

**Маргарыта ДЗЯХЦЯР**

■ Фестывалім!

# Уся справа ў... самбрэра

**Днямі прайшоў IV Міжнародны фестываль-конкурс «Новыя вяршыні — 2018». Аднаўленая сцэна Мінскага Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў, а таксама сцэна Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Глінкі прымалі ўдзельнікаў з розных краін. Цікава, што ўдзельнічаць можна было як вочна, так і завочна.**



Удзельнікі харэаграфічнага ансамбля «Тапатушкі».

Кожны год фестываль прымае творчыя калектывы з Польшчы, Украіны, Расіі, Казахстана, Літвы, Латвіі, Туркменістана і з сямідзесяці гарадоў Беларусі — і гэты год не стаў выключэннем. Колькасць удзельнікаў дасягнула больш за 5000 канкурсантаў.

Арганізатары фестывалю адзначаюць, што для іх важна было пашыраць супрацоўніцтва паміж рознымі ўстановамі адукацыі і Палацамі культуры як у нашай краіне, так і па-за яе межамі. Дзякуючы розным канцэртам, выставам, што ладзіліся ў межах фэсту, удалося годна прадставіць культурныя каштоўнасці Радзімы. Акрамя таго, такі творчы форум проста неабходны, каб знаходзіць таленавітых дзяцей і моладзь, падтрымліваць іх добрыя пачынанні, даваць старт для далейшага плённага творчага развіцця.

Фестываль уяўляў сабой не толькі конкурсную праграму ў розных намінацыях, але і разнастайныя канцэрты, забаўляльныя вечарыны для моладзі, акцыі, выставы. Натуральна, не абышлося без урачыстага адкрыцця і закрыцця, дзе малады артысты ўражвалі ўсіх сваімі прафесіяналізмам і харызмай. А ў конкурснай праграме выступоўцы спаборнічалі ў майстэрстве народнага і эстраднага вакалу, аўтарскай песні, класічнага, эстраднага, народнага, усходняга танца. У намінацыі «Інструментальная музыка» было прадстаўлена проста безліч інструментаў: баян, акардэон, домра, балалайка, гітара, цымбалы, бандура, гуслі, скрыпка, альт, віяланчэль, кантрабас і іншыя.

Хочацца асобна павіншаваць харэаграфічны ансамбль «Тапатушкі» сталічнай гімназіі № 10, які стаў лаўрэатам ІІ ступені ў намінацыі «спартыўна-бальны танец». Юныя танцоры выканалі запальную «Кукарачу», дзякуючы якой прысутныя нібы апынуліся ў гарачай, сонечнай Мексіцы. Велізарныя капелюшы-самбрэра, шырокія паясы ў хлопчыкаў, доўгія каляровыя спадніцы ў падлогу ў дзяўчат дапамаглі стварыць каларытны вобраз. Здаецца, менавіта такая, напоўненая энергіяй і сонцам, творчасць, спантанная і непрадказальная, як само жыццё, нам асабліва патрэбна цяпер, калі цёплая вясна яшчэ не ўступіла ў свае правы.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ**

# ВЫХАВАННЕ ПАЧУЦЦЯЎ — ШЛЯХ ДА ПОСПЕХУ,

## або Чаму дзецям і дарослым патрэбна мастацтва



**Што мы страчваем, калі праходзім міма мастацкай культуры? Ці праўда, што без мастацтва немагчыма паспяховае эканамічнае развіццё грамадства? І на які «незаселены» востраў трэба выпраўляць дзяцей? — на гэтыя пытанні шукаем адказы разам з мастацтвазнаўцам і заснавальнікам народнай арт-студыі «Wostrau» Юрыем ІВАНОВЫМ:**

— Уся гісторыя нашай цывілізацыі, яе важныя знакавыя падзеі і з'явы знайшлі сваё адлюстраванне ў мастацтве, літаратуры. Крок за крокам чалавек перайтварараў навакольнае асяроддзе, ствараў пэўныя артэфакты. Дастаткова ўспомніць, напрыклад, егіпецкія піраміды, старажытнагрэчаскі тэатр, готыку Сярэднявечча ці шэдэўры народнай культуры, як мы тут жа аказваемся ў пэўнай кропцы перасячэння часу і прасторы. Гісторыя культуры дапамагае нам прадметна адчуць час і дух той ці іншай гістарычнай эпохі. Таму грамадства, якое пагарджае ведамі аб мастацкай культуры, рызыкуе апынуцца без арыенціраў, на перыферыі сусветнага развіцця.

***— Але, напэўна, ёсць і эканамічная выгада ад такіх ведаў?***

— Я не думаю, што мастацтва неабходна мэтанакіравана выкарыстоўваць у якасці нейкага каталізатара вытворча-эканамічнага развіцця, але апасродкавана ў рэальнасці гэта адбываецца менавіта так. Нядаўна я сустрэў матэрыял па даследаваннях кітайскіх вучоных, якія звярнулі ўвагу, што ў бізнесе паспяхова развіваюцца тыя, хто ў дзяцінстве наведваў студыі, гурткі, захапляўся мастацкімі заняткамі. Яны больш камунікабельныя і актыўныя ў жыццёвых сітуацыях, а іх бізнес-ідэі розняцца крэатыўнасцю і арыгінальнасцю. Узаемасувязь паміж мастацтвам і прыродазнаўчымі навукамі — гэта схаваны працэс. Калі ў сусветна вядомага фізіка Альберта Эйнштэйна запыталіся, што падштурхнула яго да адкрыцця тэорыі адноснасці, вучоны адказаў, што гэтаму ў многім садзейнічала чытанне раманаў Дастаеўскага. Здавалася б, дзе сувязь паміж мастацкім тэкстам і выкладкамі тэарэтычнай фізікі? Наша цікавасць да чытання, захапленне музыкай, жывапісам, заняткі творчай практыкай заўсёды ўзнагароджваюцца — мы становімся больш эмацыянальна чулымі, вастрэй адчуваем час, набываем здольнасць глыбей пранікаць у сутнасць падзей і з'яў. Многія мастацкія творы празорліва прадугадвалі будучую хаду гісторыі. Не выпадкова ў апошнія гады часта навуковыя даследаванні носяць міждысцыплінарны характар, і ў каманду «тэхнароў» на роўных уключаюцца спецыялісты гуманітарных дысцыплін.

***— Калі роля мастацтва такая значная і актуальная, то, на ваш погляд, у якім стане знаходзяцца справы з эстэтычным выхаваннем у школе?***

— Пасля сямігадовай адсутнасці ў сярэднюю школу нарэшце вярнуўся прадмет «Сусветная мастацкая культура», цяпер ён называецца «Мастацтва». Галоўнай прычынай адмовы ад згаданага прадмета ў 2008 годзе называлася патрэба выратаваць школьнікаў ад перагрузкі, хоць вядома, што менавіта заняткі творчай дзейнасцю здольныя пераключаць нас і зараджаць новай энергіяй. На мой погляд, праблема хранічнай стомленасці хаваецца не ў напружаным вучэбным плане, а ў слабай матываці і адсутнасці жывога пазнавальнага працэсу, звернутага непасрэдна да жыцця дзіцяці. Так ці інакш, некалькі пакаленняў дзяцей выбылі з прасторы эстэтычнага выхавання на доўгія сем гадоў. Для параўнання варта ўспомніць, як спраўна дзейнічала сістэма мастацкай асветы ў савецкі час. Выдаваліся помнікі сусветнай літаратуры, адаптаваныя для чытання ў дзіцячым узросце. Развівалася кіно і выходзілі тэлепраграмы для дзяцей і юнацтва. Дзеці 50-х гадоў мінулага стагоддзя мелі магчымасць знаёміцца з міфалогіяй, сусветнай архітэктурай, мастацтвам, творчасцю вялікіх майстроў дзякуючы візуальным лекцыям, якія выпускала студыя «Дыяфільм». Сёння свет стаіць перад выклікам недалёкага будучага. Ці адбудзецца гарманічнае супрацоўніцтва паміж разумнай і бессардэчнай машынай і яе стваральнікам-чалавекам. У вырашэнні гэтай праблемы асаблівае месца аддаецца адукацыі, якая, на жаль, па-ранейшаму арыентавана на запамінанне ведаў і навучанне вылічэнням, значыць, на ўсё тое, што машына робіць лепш за чалавека. Нашы дзеці павінны быць творчымі і інавацыйнымі, а для гэтага ім акрамя інтэлекту спатрэбіцца эмацыянальнае развіццё і высокі каэфіцыент чалавекалюбства, таго, што заснавальнік фірмы «Alibaba» Джэк Ма называе каэфіцыентам любові (QL). А гэта значыць, што мы павінны павярнуцца тварам да культуры. Эстэтычная і маральная пазіцыя фарміруецца не законамі матэматыкі і фізікі, а на ўроках літаратуры, музыкі, малявання, — на тэрыторыі гуманітарных ведаў. Менавіта тут адбываецца выхаванне чалавечых якасцяў, разуменне дабра і зла.

Зараз відавочна, якую важную ролю адыграла і працягвае выконваць дадатковая адукацыя. У атрыманай сітуацыі гурткі і студыі ва ўстановах дадатковай адукацыі сталі практычна адзіным прыстанкам творчага развіцця дзяцей. Праўда, раней на занятки ў студыю прыходзілі дзеці, якія ў школе ўжо нешта даведваліся пра міфалогію, антычнасць, ім былі знаёмыя імёны мастакоў, кампазітараў, і ўсё гэта, зразумела, станавілася падставай для роздуму, было адлюстравана ў іх творчых работах. Сёння нашым школьнікам малазразумелая метафарычная мова сучаснага тэатра, часта звернутага да міфалагічных сюжэтаў, затое большасці дзяцей вядомыя імёны Мікеланджэла, Рафаэля, але для іх гэта героі анімацыі «Чарапашкі Ніндзя».



***— Якія асноўныя прынцыпы вашай педагагічнай сістэмы?***

— Мы прымаем у студыю дзяцей з трох гадоў. Такі малы ўжо на першых занятках хапае пэндзлік і пачынае адважна маляваць. Ён яшчэ не сапсаваны пытаннямі «што і як рабіць». Калі ж дзіця баіцца маляваць — гэта азначае, што дарослыя ўжо заранілі сумненне, што яно няправільна гэта робіць. І гэта вялікая праблема! Пачатковая стадыя аўтэнтычнага дзіцячага малявання — гэта спантанная гульня, у час якой усхваляванае дзіця пакідае на паперы энергічныя, вонкава хаатычныя штрыхі. Калі маленькі мастак блукае ў каляровых лабірынтах, ён паступова стварае свой уласны свет. Гэта дзівосная здольнасць дзіцяці пазнаваць навакольнае жыццё сродкамі яго адлюстравання — бясцэнны вопыт, які спатрэбіцца ў больш сталым узросце. На жаль, так званыя «калякі-малякі», якія з'яўляюцца тыповым вынікам творчай дзейнасці дзіцяці, не гатовыя ўспрыняць многія бацькі і педагогі.

***— Атрымліваецца, што сваімі парадамі і адзнакамі самі бацькі могуць нанесці шкоду дзіцяці?***

— Дзеці здольныя на большае, чым ім прапануюць дарослыя, — тую сумную выканаўчую працу, накшталт штрыхоўкі размалёвак ці заданняў «дамаляваць» домікі і сабачак. А якія цудоўныя рэчы атрымліваюцца ў маленькіх творцаў, калі ім стварыць здаровае асяроддзе, быць побач і не перашкаджаць! Часам хочацца выправіць дзяцей з нашага перагружанага непатрэбнай інфармацыяй свету на незаселены востраў, каб яны аказаліся ў нязвыклым асяроддзі, адчулі пахі лесу, спевы птушак, навучаліся марыць, ствараць рэчы, рэальна патрэбныя для жыцця, і вучыцца дзяліцца гэтым з іншымі. Відавочна, гэта нездзяйсняльная ўтопія, таму дзіцяці трэба дапамагчы арыентавацца ў рэальнасці, выбіраць і адстойваць сапраўдныя каштоўнасці ў жыцці і мастацтве. І няхай яны вучацца пераадольваць розныя цяжкасці, робяць памылкі, спрачаюцца з намі, давяраюць нам свае патаемныя думкі, але толькі не маўчаць абыякава. Успомнім кнігу вядомага літаратара і паэта Карнея Чукоўскага «Ад двух да пяці», якая выйшла ў 1928 годзе. Аўтар свядома захаваў «няправільнасць» лексікі сваіх маленькіх персанажаў і прапануе не толькі ад душы пасмяяцца над «прыколамі» малых, але і ўразіцца вобразнай выразнасцю і арыгінальнасцю дзіцячай мовы, прымушае задумацца аб адказнасці нас дарослых перад таемным і крохкім храмам дзяцінства, аб правах дзіцяці на ўласную культурную тэрыторыю. Але ў рэальным жыцці часта ўсё наадварот: замест творчага чалавека побач з дзіцем аказваецца настаўнік, які падмяняе дзіцячую творчасць рамесніцкім уменнем, каб аднойчы пахваліцца: «Глядзіце, мой вучань малюе, як дарослы!» Да нас прыходзяць падлеткі, якія за 5—7 гадоў прайшлі ўжо не адну студыю выяўленчага мастацтва. Яны даволі ўпэўнена валодаюць акадэмічным малюнкам, але губляюцца, калі трэба папрацаваць на вольную тэму. Чакаюць задання ад выкладчыка. Іх навучылі маляваць, але не навучылі самастойна думаць, не дапамаглі адкрыць сябе, таму ў іх няма сваёй тэмы, свайго стаўлення да жыцця.

***— Прадмет «Сусветная мастацкая культура» ўжо вярнуўся ў школу, які, на ваш погляд, павінен быць яго змест?***

— За гэты перыяд многае адбылося, змяніўся сацыяльна-культурны кантэкст. Наўрад ці сёння дзіця пагодзіцца памяняць яскравыя дынамічныя малюнкі смартфона ці планшэта на бляклыя рэпрадукцыі падручніка. Вяртацца трэба на іншым узроўні. Стаўку трэба рабіць не столькі на інфармацыю, а на ўцягненне вучняў у асяроддзе творчай вытворчасці. Да традыцыйных мастацкіх сродкаў дадаліся новыя медыя. Смартфон — гэта цэлая творчая лабараторыя ў руках школьніка. Сёння з ім падлетак можа здымаць кіно, займацца мастацкай фатаграфіяй, ствараць сацыяльна-культурныя праекты, напрыклад, пра свой горад, гісторыю сям'і, маладзёжную субкультуру. Як пераначкіраваць моднеты заданні? Гэта захапленні дзяцей на цікавую і перспектыўную для іх самых рэальную справу? Гэтым павінны захапіць дзяцей цікавыя людзі, настаўнікі-прафесіяналы. Сёння столькі маладых людзей, якія скончылі творчыя ВНУ, яны маглі б і займацца з дзецьмі, калі б на базе школ у іх была магчымасць атрымаць творчую майстэрню. Трэба паклікаць такую моладзь у школу. Няхай яна стварае кластарнае асяроддзе, займаецца тэатрам, музыкай, арганізуе выстаўкі і лекцыі пра мастацкую культуру. Вось гэта і будзе рэальная аснова для выхавання будучых спецыялістаў у галіне мастацтва і крэатыўных індустрый, якія паспяхова развіваюцца ў свеце і складаюць адчувальны сектар эканомікі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**



## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## на 31 ДЕКАБРЯ 2017 г.

| | |
|---|---|
| Организация | Открытое акционерное общество «Амкодор-Белвар» (сводный со структурными подразделениями) |
| Учетный номер плательщика | 100363840 |
| Вид экономической деятельности | Производство бытовых электрических машин и приборов |
| Организационно-правовая форма | Открытое акционерное общество |
| Орган управления | ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга» |
| Единица измерения | тыс. руб. |
| Адрес | 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 58 |

| Активы | Код строки | На 31 ДЕКАБРЯ 2017 г. | На 31 ДЕКАБРЯ 2016 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 32 774 | 32 473 |
| Нематериальные активы | 120 | 54 | 1 |
| **Доходные вложения в материальные активы** | **130** | **146** | **152** |
| В том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | 146 | 152 |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | – | – |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | – | – |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 77 | 57 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 104 | 104 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | – | – |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | – | – |
| в том числе аккредитивы | 171 | – | – |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | – | – |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **33 155** | **32 787** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| **Запасы** | **210** | **6160** | **6557** |
| В том числе: материалы | 211 | 3413 | 3132 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | – | – |
| незавершенное производство | 213 | 736 | 947 |
| готовая продукция и товары | 214 | 2011 | 2478 |
| товары отгруженные | 215 | – | – |
| прочие запасы | 216 | – | – |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | – | – |
| Расходы будущих периодов | 230 | 467 | 461 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 5 | 1 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 3514 | 4065 |
| в том числе аккредитивы | 251 | – | – |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | – | – |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 531 | 241 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 4 | 96 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **10 681** | **11 421** |
| **БАЛАНС** | **300** | **43 836** | **44 208** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 ДЕКАБРЯ 2017 г. | На 31 ДЕКАБРЯ 2016 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 24 863 | 24 863 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | – | – |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | – | – |
| Резервный капитал | 440 | 184 | 184 |
| Добавочный капитал | 450 | 1804 | 1804 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | ( 892) | ( 909) |
| Чистая прибыль(убыток) отчетного года | 470 | – | – |
| Целевое финансирование | 480 | – | – |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **25 959** | **25 942** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 4069 | 4868 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | – | – |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | – | – |
| Доходы будущих периодов | 540 | 2217 | 2217 |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | – | – |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | 594 | 24 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **6880** | **7109** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 4714 | 4907 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 818 | 891 |
| **Краткосрочная кредиторская задолженность** | **630** | **5243** | **5134** |
| В том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 3237 | 3640 |
| по авансам полученным | 632 | 1076 | 385 |
| по налогам и сборам | 633 | 140 | 287 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 130 | 138 |
| по оплате труда | 635 | 399 | 384 |
| по лизинговым платежам | 636 | – | – |
| собственнику имущества (учредителям, участникам ) | 637 | – | – |
| прочим кредиторам | 638 | 261 | 300 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | – | – |
| Доходы будущих периодов | 650 | 205 | 166 |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | 17 | 13 |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | – | 46 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **10 997** | **11 157** |
| **БАЛАНС** | **700** | **43 836** | **44 208** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
## за январь – декабрь 2017 г.

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2017 г. | За январь – декабрь 2016 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 19 998 | 20 495 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (17 158) | (18 496) |
| **Валовая прибыль** | **030** | **2840** | **1999** |
| Управленческие расходы | 040 | (1078) | (980) |
| Расходы на реализацию | 050 | (650) | (619) |
| **Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг** | **060** | **1112** | **400** |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 14 353 | 11 642 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (15 624) | (12 207) |
| **Прибыль (убыток) от текущей деятельности** | **090** | **(159)** | **(165)** |
| **Доходы по инвестиционной деятельности** | **100** | **1 276** | **2 027** |
| В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 1103 | 1355 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | 80 | 264 |
| проценты к получению | 103 | – | 208 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 93 | 200 |
| **Расходы по инвестиционной деятельности** | **110** | **(288)** | **(424)** |
| В том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (281) | (91) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (7) | (333) |
| **Доходы по финансовой деятельности** | **120** | **1225** | **1220** |
| В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 1184 | 1220 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 41 | – |
| **Расходы по финансовой деятельности** | **130** | **(1949)** | **(2459)** |
| В том числе: проценты к уплате | 131 | (581) | (1059) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (1359) | (1389) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (9) | (11) |
| **Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой деятельности** | **140** | **264** | **364** |
| **Прибыль (убыток) до налогообложения** | **150** | **105** | **199** |
| Налог на прибыль | 160 | (80) | (73) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | – | – |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | – | – |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | – | – |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (8) | (10) |
| **Чистая прибыль (убыток)** | **210** | **17** | **116** |
| Количество прибыльных организаций | 211 | 1 | 1 |
| Сумма прибыли | 212 | 17 | 116 |
| Количество убыточных организаций | 213 | – | – |
| Сумма убытка | 214 | – | – |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | – | – |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | – | – |
| **Совокупная прибыль (убыток)** | **240** | **17** | **116** |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию, рублей | 250 | – | – |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию, рублей | 260 | – | – |

| **4. Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %):** | | 0 |
|---|---|---|
| **Вид собственности** | **Количество акций, шт.** | **Доля в уставном фонде, %** |
| республиканская | 0 | 0 |
| коммунальная всего: | 0 | 0 |
| в том числе: | x | x |
| областная | 0 | 0 |
| районная | 0 | 0 |
| городская | 0 | 0 |

**5-6. Информация о дивидендах и акциях**

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 1672 | 1672 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 2 | 2 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 0 | 0 |
| в том числе: физических лиц | лиц | 1670 | 1670 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 1 | 1 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 0,00 | 0,00 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 0,00 | 0,00 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,000000 | 0,000000 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа ___ | рублей | 0,000000 | 0,000000 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа ___ | рублей | 0,000000 | 0,000000 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,000000 | 0,000000 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа ___ | рублей | 0,000000 | 0,000000 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа ___ | рублей | 0,000000 | 0,000000 |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | 0 | X |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | 0 | X |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | 0 | X |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 9,65 | 9,65 |
| Количество акций, находящихся на балансе общества, – всего | штук | 0 | 0 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **8. Среднесписочная численность работающих** | человек | 805 | 913 |

**9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета):**
Основной вид деятельности – производство бытовых электрических машин и приборов (кроме холодильников и морозильников) (код 27511), вид продукции – электромясорубки (код 27.51.21.770). Выручка от реализации по основному виду деятельности по состоянию на 01.01.2018 г. составила 7467,59 тысяч рублей (37,34 % от общего объема выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг).

**10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год:**
20 марта 2018 г. за отчетный 2017 г.

**13.Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета):** применяются.

**14. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет:** www.amkodor-belvar.by

Руководитель Цуриков Андрей Юрьевич

Главный бухгалтер Павлович Лилия Федоровна

22 марта 2018 г.

## Аудиторское заключение по бухгалтерской отчетности Открытого акционерного общества «Амкодор-Белвар» за 2017 год

Получатель аудиторского заключения: директор Открытого акционерного общества «Амкодор-Белвар» Цуриков Андрей Юрьевич

**Аудиторское мнение**

Мы провели аудит годовой бухгалтерской отчетности ОАО «Амкодор-Белвар» (находящегося по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, д. 58, зарегистрированного Минским городским исполнительным комитетом 31 октября 2011 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за номером 100363840), состоящей из: бухгалтерского баланса по состоянию на 31 декабря 2017 года, отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату; примечаний к бухгалтерской отчетности, предусмотренных законодательством Республики Беларусь.

По нашему мнению, прилагаемая годовая бухгалтерская отчетность ОАО «Амкодор-Белвар» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Амкодор-Белвар» по состоянию на 31 декабря 2017 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств, за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**Основание для выражения аудиторского мнения**

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности. Наши обязанности в соответствии с этими требованиями описаны далее в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита бухгалтерской отчетности» настоящего заключения. Нами соблюдались принцип независимости по отношению к аудируемому лицу согласно требованиям законодательства и нормы профессиональной этики. Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения.

**Ключевые вопросы аудита**

Ключевые вопросы аудита – это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, являлись наиболее значимыми для проводимого аудита бухгалтерской отчетности за текущий период. Мы определили, что ключевые вопросы аудита, о которых необходимо сообщить в нашем аудиторском заключении, отсутствуют.

**Существенная неопределенность в отношении непрерывности деятельности**

Мы обращаем внимание на то, что на конец отчетного периода значений коэффициентов текущей ликвидности и обеспеченности собственными оборотными средствами ниже нормативных в течение четырех кварталов, предшествующих составлению последней бухгалтерской отчетности. Кроме того, значение коэффициента обеспеченности обязательств активами ниже нормативного. Таким образом, неплатежеспособность ОАО «Амкодор-Белвар» приобретает устойчивый характер.

Под неплатежеспособностью понимается неспособность в полном объеме удовлетворить требования кредитора (кредиторов) по платежным обязательствам, а также по обязательствам, вытекающим из трудовых и связанных с ними отношений (абз. 34 ст. 1 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

Изложенные в настоящем разделе события или условия указывают на наличие существенной неопределенности, которая может вызвать значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно. Мы не выражаем модифицированного аудиторского мнения в связи с этим вопросом.

**Обязанности аудируемого лица по подготовке бухгалтерской отчетности**

Руководство аудируемого лица несет ответственность за подготовку и достоверное представление бухгалтерской отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь и организацию системы внутреннего контроля аудируемого лица, необходимой для подготовки бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.

При подготовке бухгалтерской отчетности руководство аудируемого лица несет ответственность за оценку способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно и уместности применения принципа непрерывности деятельности, а также за надлежащее раскрытие в бухгалтерской отчетности в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать аудируемое лицо, прекратить его деятельность или когда у него отсутствует какая-либо иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

Лица, наделенные руководящими полномочиями, несут ответственность за осуществление надзора за процессом подготовки бухгалтерской отчетности аудируемого лица.

**Обязанности аудиторской организации по проведению аудита бухгалтерской отчетности**

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что бухгалтерская отчетность аудируемого лица не содержит существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий, и в составлении аудиторского заключения, включающего выраженное в установленной форме аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения. Искажения могут возникать в результате ошибок и (или) недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей бухгалтерской отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, аудиторская организация применяет профессиональное суждение и сохраняет профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

– выявляем и оцениваем риски существенного искажения бухгалтерской отчетности вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры в соответствии с оцененными рисками; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений бухгалтерской отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения искажений в результате ошибок, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие;

– получаем понимание системы внутреннего контроля аудируемого лица, имеющей значение для аудита, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения аудиторского мнения относительно эффективности функционирования этой системы;

– оцениваем надлежащий характер применяемой аудируемым лицом учетной политики, а также обоснованности учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в бухгалтерской отчетности;

– оцениваем правильность применения руководством аудируемого лица допущения о непрерывности деятельности, и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, что имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии такой существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в аудиторском заключении к соответствующему раскрытию данной информации в бухгалтерской отчетности. В случае если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим, нам следует модифицировать аудиторское мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что аудируемое лицо утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;

– оцениваем общее представление бухгалтерской отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также того, обеспечивает ли бухгалтерская отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля.

Мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

Директор ООО «АСБ Консалт» Т. В. Набокова

Аудитор ООО «АСБ Консалт» И. А. Гапонова

Информация об аудиторской организации:
Наименование: общество с ограниченной ответственностью «АСБ Консалт».
Юридический адрес: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, к. 704.
Государственная регистрация: ООО «АСБ Консалт» зарегистрировано Минским горисполкомом 27.05.2015 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей с регистрационным номером 192482938.
Дата подписания аудиторского заключения: 20 марта 2018 года.

■ Жыццёвінкі

# У КОЖНАГА СВОЙ ЗАНЯТАК



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

## Прыхільнік Сабанеева?

Хоць з таго часу і мінула ўжо два гады, але і дагэтуль Васіль Васілевіч, з аднаго боку, саромеецца, а з другога — задаволены той слабінкай, якую ён дапусціў тады. У заводскім прафілакторыі як было? Адпачываў сабе на ўсе сто. Любаваўся прыгожымі краявідамі, дыхаў свежым, настоеным на хвойным паху паветры, збіраў лугавыя кветкі, хадзіў на танцы. І гэтак далей. Не жыццё было, а маліна. А тут мужыкі з іхняга цэха падбіваць яго пачалі. Ты, Васільевіч, запэўнівалі, калі хочаш па-сапраўднаму здароўе падмацаваць, рыбалкай займіся. Як мы, бо гэта — стымул найважнейшы для ўзняцця настрою, для абуджэння душы. Па-новаму на ўсё зірнеш тады.

Васіля Васілевіча рыбалка ніколі не цікавіла. Праўда, збіраючыся ў прафілакторый, ён прыхапіў з сабой сынаву вуду. Так, на ўсякі выпадак, але ні на рэчку, ні на азярыны з ёй так і не выбіраўся, з чаго і кпілі заводскія аднакашнікі, якія ўсё больш і больш настойвалі: давай хоць разок да нас прылучыся. Калі не ўмееш, дык навучым. А далей усё пойдзе як мае быць.

І Васіль Васілевіч адважыўся на наступны крок. У іхняй кампаніі яны яго не ўбачаць, бо засмяяць няўмеку могуць (бо ён і кручок як трэба прывязаць не можа, і з якога боку чарвяка на яго прычапіць не ведае), а вось адзін — паспрабуе выправіцца да вады. Самастойна будзе лавіць.

Як было задумана, так і зроблена.

Атабарыўшыся каля дуба, за якім потым густа ішлі лазнякі, што навісалі над вадой, эканаміст механічнага цэха Васіль Васілевіч Гусакоў першы раз у жыцці прыладкаваў таўшчэзнага чарвяка-выпаўзка да кручка і, размахнуўшыся, шыбануў вудай у рачны прастор. І от, на табе: паплавок тут жа пусціўся ў польку-трасуху. У Васіля Васілевіча так дух перахапіла, што ён з усяе сілы шмаргануў на сябе вудзільна, і лёска, апісаўшы паўдугі, увагнала ў яго куртку кручок. Паўгадзіны валтузіўся навапспечаны рыбак над ім і нарэшце, вызваліўшы яго з палону, сцяміў, што калі спешка патрэбна пры лоўлі блох, дык пры лоўлі рыбы яна толькі шкодзіць.

Таму пачаў дзейнічаць з асцярожнасцю, чакаючы наступнай полечкі-трасухі. Але яе не было. Паплавок спаў у затоцы гэтак жа моцна, як вартаўнік калгаснага сада дзядзька Піліп у сваім будане, калі ён, падлетак Васіль, з такімі ж, як сам, падшыванцамі напаўнялі яблыкамі запазухі.

Гадзіна, другая, трэцяя. Мёртва. Васіль Васілевіч у чаканні. Цярпенне, і яшчэ раз цярпенне, супакойваў сябе. Гэта не лічбы сухія па камп'ютары ганяць, а — рыбалка. Жывая штуковіна. У такім вось роздуме Гусакоў раптам учуў за лазнякамі нейкі плёскат. І праз тры-пяць хвілін — пайшло-паехала! А праз дзесяць — на ладненькай, мабыць больш як на кілаграм, нізцы, дружна махалі хвастамі ў вадзе каля самага берага акуні-«матросікі».

